АіВ
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
ВЫДАВЕЦТВА

*Серыя «У дапамогу педагогу»*
*заснавана ў 1995 годзе па ініцыятыве У. П. Пархоменкі*

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць 6 разоў у год

# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

**№ 4 (34) ' 2004**

**Заснавальнік і выдавец —**
**Установа «Выдавецтва**
**«Адукацыя і выхаванне»**

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
**М. І. Мініцкі**

*Першы намеснік галоўнага рэдактара*
**У. В. Тугай**

*Намеснік галоўнага рэдактара*
**Н. М. Ганушчанка**

*Адказны сакратар*
**Л. В. Саламаха**

*Члены рэдкалегіі*

**І. І. Багдановіч**
**М. М. Забаўскі**
**В. А. Капранава**
**Г. А. Космач**
**У. С. Кошалеў**
**У. М. Міхнюк**
**С. В. Паноў**
**А. П. Сманцар**
**М. С. Сташкевіч**
**К. І. Сякацкая**
**В. М. Фамін**
**І. І. Цыркун**
**В. М. Шутава**
**М. М. Шэпель**
**А, А. Яноўскі**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 229-19-71, факс: 220-54-10
e-mail: aiv@mail.by
http://www.aiv.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Аляксандр Каваленя, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі БДПУ імя Максіма Танка*

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ПА ВЫВУЧЭННІ Ў ШКОЛАХ І СЯРЭДНІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ ФАКУЛЬТАТЫВА «ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА» (у кантэксце Другой сусветнай вайны)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў

Асвятляючы акрэсленую праблему, настаўніку пажадана нагадаць, што ў выніку ўпартых баёў восенню і зімой 1943–1944 гг. войскі Чырвонай Арміі поўнасцю або часткова вызвалілі 36 раёнаў Беларусі, 36 райцэнтраў і два абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр. Тут пачало аднаўляцца мірнае жыццё. Адной з першачарговых задач стала наладжванне жыццядзейнасці людзей, якія перанеслі жудасныя ўмовы акупацыі. Ужо да лета 1944 года было адноўлена і пабудавана 8429 жылых дамоў.

Пачалі працаваць бальніцы, сельскія ўрачэбныя ўчасткі, фельчарска-акушэрскія пункты, адчыняліся аптэкі, школы і навучальныя ўстановы. У вызваленых раёнах адкрыліся 1458 школ, у якіх навучалася каля 150 тыс. дзяцей. Было створана 37 дзіцячых дамоў, у якіх выхоўвалася больш за 3 700 дзяцей, што засталіся без бацькоў. Педагагічныя кадры рыхтавалі настаўніцкі інстытут у Мазыры, педвучылішчы ў Гомелі, Клімавічах, Крычаве, Мазыры, Рэчыцы. Яшчэ 1 кастрычніка 1943 года на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. Да пачатку беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» ужо функцыянавалі 24 дамы культуры, 503 хаты-чытальні, 44 гарадскія і раённыя бібліятэкі і абласная бібліятэка ў Гомелі. У лістападзе 1943 года дзейнічала кінасетка (54 кінаўстаноўкі, 9 кінатэатраў), устаноўлена звыш 5 тыс. радыёкропак.

Пераадольваючы значныя цяжкасці першых месяцаў жыцця на вызваленай ад нямецка-фашысцкіх акупантаў зямлі, жыхары Беларусі разгарнулі вялікую работу па аказанні дапамогі Чырвонай Арміі ў яе рашаючых баях за поўнае выгнанне захопнікаў з тэрыторыі рэспублікі. Адноўленыя прадпрыемствы дапамагалі войскам Чырвонай Арміі рамантаваць зброю, ваенную тэхніку, перапрацоўваць харчовыя прадукты, што ў значнай ступені садзейнічала паспяховаму ажыццяўленню Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён».

***Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён».*** Да лета 1944 года на савецка-германскім фронце склалася спрыяльнае становішча для наступальных дзеянняў Чырвонай Арміі, якая трывала ўтрымлівала стратэгічную ініцыятыву. Лінія фронту на беларускім участку да гэтага часу праходзіла на ўсход ад Бабруйска, Віцебска, Жлобіна, Магілёва, Оршы, Полацка, на захад ад Мазыра і далей уздоўж ракі Прыпяць да Ковеля, агінаючы Беларусь з поўначы і поўдня амаль на ўсю глыбіню яе тэрыторыі.

Гэта гіганцкае выступленне мела важнае стратэгічнае значэнне ў сістэме абароны нямецкіх войскаў, бо яно прыкрывала галоўныя стратэгічныя напрамкі — Усходнерускі і Варшаўска-Берлінскі, забяспечвала ўстойлівае становішча паўночнай групы армій ворага ў Прыбалтыцы.

На тэрыторыі Беларусі гітлераўцы стварылі моцную абарону глыбінёй да 270 км пад назвай «Фатэрлянд» («Бацькаўшчына»), тым самым падкрэсліваючы, што ад яе залежыць лёс Германіі. Спецыяльным загадам Гітлера гарады Бабруйск, Барысаў, Віцебск, Магілёў, Мінск, Орша абвяшчаліся крэпасцямі. Камандуючыя гарадамі-крэпасцямі давалі фюрэру пісьмовыя абавязацельствы ўтрымліваць іх да гібелі апошняга салдата, нават ва ўмовах акружэння. Тут была сканцэнтравана група армій «Цэнтр», частка правафланговых злучэнняў групы армій «Поўнач» і левафланговых — групы армій «Паўночная Украіна» — усяго 63 дывізіі і 3 брыгады, якія налічвалі звыш 1200 тыс. чалавек, 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, каля 1300 самалётаў. Агульнае камандаванне ўзначальваў генерал-фельдмаршал Э. Буш, якога пазней замяніў генерал-фельдмаршал В. Модэль.

Напрамак галоўнага ўдару летам 1944 года савецкае камандаванне вызначыла ў Беларусі. Перад войскамі была пастаўлена задача разбіць германскія войскі групы армій «Цэнтр», вызваліць Беларусь, выйсці да дзяржаўнай граніцы СССР і поўнасцю ачысціць савецкую тэрыторыю ад акупантаў. План летняга наступлення ў Беларусі распрацоўваўся ў Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання і Генеральным штабе. У падрыхтоўцы аперацыі прымалі ўдзел І. В. Сталін, Г. К. Жукаў, А. М. Васілеўскі, А. І. Антонаў, А. А. Новікаў, Н. Н. Воранаў, К. К. Ракасоўскі, А. В. Хрулеў, Н. Д. Якаўлеў, І. Т. Перасыпкін, Я. Н. Федарэнка і іншыя.

Ваенна-палітычнае кіраўніцтва СССР надавала вялікую ўвагу распрацоўцы наступальнай аперацыі. Яе паспяховая рэалізацыя дазваляла войскам Чырвонай Арміі не толькі вызваліць тэрыторыю СССР, але і выйсці да межаў трэцяга рэйха. План аперацыі некалькі разоў абмяркоўваўся ў Стаўцы. Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі перадае ва ўспамінах усю напружанасць і адказнасць прыняцця рашэння:

*В течение марта и апреля замысел летней кампании неоднократно обсуждался и уточнялся у Верховного Главнокомандующего. Г. К. Жукова и меня несколько раз вызывали в Москву.*

*Много раз Верховный Главнокомандующий говорил с нами об отдельных деталях по телефону. При этом Сталин нередко ссылался на свои переговоры по этим вопросам с командующими войсками фронтов, особенно с К. К. Рокоссовским... В начале апреля в одном из разговоров он сообщил мне, что склонен, вопреки возражениям командующего Ленинградским фронтом Л. А. Говорова, снова разделить этот фронт на два... Тогда же он поставил мне и другой вопрос, который обсуждался в Ставке — о разделении Западного фронта...*

*В первой половине апреля 1944 года Генеральный штаб с разрешения Верховного Главнокомандующего запросил мнение командующих соответствующими фронтами о летней кампании и проведении Белорусской операции... 20 мая разработанный Генштабом план Белорусской операции был представлен Верховному Главнокомандующему. Вскоре он был рассмотрен в Ставке с участием некоторых командующих и членов Военных советов фронтов. В ближайшие же дни Генштаб должен был представить уточненный план на окончательное утверждение в Ставку.*

*Вместе с Г. К. Жуковым и А. И. Антоновым я неоднократно бывал в те дни у Верховного Главнокомандующего. Каждый раз во время этих встреч мы возвращались к обсуждению деталей плана и проведения Белорусской операции, получившей название «Багратион»...*

*30 мая Ставка окончательно утвердила план операции «Багратион» ... Утверждая 30 мая план Белорусской операции, Сталин, как это было уже не раз, заявил, что ближайшая задача Ставки — помочь командованию и войскам фронтов получше подготовить и провести задуманную операцию, а ГКО и Генштаб обязаны принять меры к тому, чтобы своевременно и полностью обеспечить войска всем необходимым.*

*Он предложил направить Г. К. Жукова и меня в Белоруссию в качестве представителей Ставки и спросил, на какие фронты мы хотели бы поехать... В ночь на 31 мая Сталин, Жуков, я и Антонов отработали в Ставке частные директивы фронтам белорусского направления, указания немедленно приступить к подготовке операции «Багратион» и конкретные задачи на первый этап ее проведения.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Звяртаючыся да гісторыі распрацоўкі плана Беларускай наступальнай аперацыі, нельга не нагадаць пра адзін цікавы эпізод. Так, калі размова зайшла пра магчымасць ажыццяўлення баявых дзеянняў, у дыскусію настойліва ўключыўся Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі, якога Сталін паважаў і нават называў «мой Баграціён». Ён выказаў пярэчанне Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму. У сваіх успамінах К. К. Ракасоўскі піша:

> *Верховный Главнокомандующий и его заместители настаивали на том, чтобы нанести один главный удар с плацдарма на Днепре (район Рогачева), находившегося в руках 3-й армии. Дважды мне предлагали выйти в соседнюю комнату, чтобы продумать предложение Ставки. После каждого такого «продумывания» приходилось с новой силой отстаивать свое решение. Убедившись, что я твердо настаиваю на нашей точке зрения, Сталин утвердил план операции в том виде, как мы его представили. «Настойчивость командующего фронтом, — сказал он, — доказывает, что организация наступления тщательно продумана. А это надёжная гарантия успеха».*

***Дзеянні франтоў. Акружэнне і разгром германскіх групіровак пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам.*** Удар па цэнтральнай групіроўцы ворага на фронце працягласцю 700 км нанеслі чатыры франты: **1-ы Прыбалтыйскі** пад камандаваннем генерала арміі **І. Х. Баграмяна, 1-ы, 2-і** і **3-і Беларускія франты** пад камандаваннем генерал-палкоўніка **І. Д. Чарняхоўскага,** генерал-палкоўніка **Г. Ф. Захарава,** генерала арміі **К. К. Ракасоўскага.** Іх аб'яднаныя сілы налічвалі 2400 тыс. чалавек баявога складу, каля 32 тыс. гармат і мінамётаў, 5200 танкаў і самаходных гармат, каля 5 тыс. самалётаў.

**Дваццаць другога чэрвеня 1944 года** — за дзень да пачатку агульнага наступлення — была праведзена разведка боем. На ўчастку фронту працягласцю 450 км адначасова дзейнічалі 45 разведвальных падраздзяленняў. Раніцай **23 чэрвеня** галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў пасля моцнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках. Назаўтра пачалі наступаць войскі 1-га Беларускага фронту на Бабруйскім напрамку. Дзеянні франтоў, як ужо адзначалася, каардынавалі прадстаўнікі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання маршалы А. М. Васілеўскі і Г. К. Жукаў.

На ўсіх напрамках наступленне савецкіх войскаў разгортвалася хутка. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту ва ўзаемадзеянні з войскамі 3-га Беларускага фронту 25–27 чэрвеня акружылі і разбілі віцебскую групіроўку гітлераўцаў у складзе 5 дывізій. **26 чэрвеня** быў вызвалены Віцебск, **28 чэрвеня** — Лепель. Праціўнік страціў тут 20 тыс. забітымі, больш за 10 тыс. салдат і афіцэраў трапілі ў палон.

**Дваццаць шостага чэрвеня** войскі 3-га Беларускага фронту ліквідавалі моцны вузел абароны ворага каля Оршы, вызвалілі Дуброўна, Сянно, Талачын. Адначасова войскі 2-га Беларускага фронту разгарнулі аперацыі на Магілёўскім напрамку. Зламаўшы моцныя абарончыя рубяжы праціўніка, яны фарсіравалі Дняпро і **28 чэрвеня** авалодалі Быхавам, Клічавам, Магілёвам, Шкловам. Да гэтага ўчастка былі прыцягнуты галоўныя сілы 4-й нямецкай арміі, што садзейнічала яе акружэнню і поўнаму разгрому.

Войскі 1-га Беларускага фронту да **29 чэрвеня** акружылі і поўнасцю разгрупілі Бабруйскую групіроўку ворага ў складзе больш за 6 дывізій. На полі бою гітлераўцы пакінулі 50 тыс. чалавек забітымі, у палон было захоплена 23 680 салдат і афіцэраў.

За шэсць дзён наступлення пад ударамі войскаў чатырох франтоў магутная абарона германскіх войскаў на прасторы паміж Заходняй Дзвіной і Прыпяццю рухнула. Былі вызвалены сотні населеных пунктаў, у тым ліку гарады Бабруйск, Віцебск, Магілёў, Орша. Цяпер перад савецкімі войскамі стаяла задача — шляхам двухбаковага ахопу з раёна Барысава і Асіповічаў на Мінск і франтальнага праследжвання ў напрамку Магілёў — Мінск завяршыць акружэнне, знішчыць галоўныя сілы 4-й нямецкай арміі, якая адступала на захад, і выз-

валіць Мінск. Войскі 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх франтоў прыступілі да іх выканання.

Тым часам 1-ы Прыбалтыйскі фронт працягваў наступленне на паўночны захад ад Полацка і на захад у агульным напрамку на Глыбокае. **Чацвёртага ліпеня** Полацк быў вызвалены. Войскі фронту, прасунуўшыся з 29 чэрвеня па 4 ліпеня на захад на 120–130 км, выйшлі на подступы да Літвы з усходу, поўнасцю ізаляваўшы адну ад адной варожыя групы армій «Цэнтр» і «Поўнач».

**Трыццатага чэрвеня** войскі 3-га Беларускага фронту фарсіравалі Бярэзіну, разбілі барысаўскую групіроўку ворага і вызвалілі Барысаў — важны апорны пункт нямецкай абароны, які прыкрываў подступы да Мінска. Другога ліпеня войскі Чырвонай Арміі абышлі яго з паўночнага захаду, авалодалі Вілейкай, Красным і перахапілі чыгунку Мінск — Вільнюс.

Дзеянні войскаў 1-га Беларускага фронту, якія наступалі на поўдзень ад Мінска, **30 чэрвеня** вызвалілі Гарадзею, Нясвіж, Слуцк, закрылі праціўніку адыход на паўднёвы захад. На досвітку 3 ліпеня 2-і гвардзейскі танкавы корпус 3-га Беларускага фронту ўварваўся ў Мінск з усходу. У сярэдзіне дня з поўдня ў горад увайшоў 1-ы гвардзейскі танкавы корпус 1-га Беларускага фронту, а з поўначы — часці 5-й гвардзейскай танкавай арміі, 11-й гвардзейскай і 33-й армій. У другой палове дня **3 ліпеня 1944 года** сталіца Беларусі была ачышчана ад ворага.

З выхадам злучэнняў 3-га і 1-га Беларускіх франтоў да Мінска і яго вызваленне было завершана акружэнне 4-й нямецкай арміі і некаторых іншых часцей ворага на ўсход ад сталіцы. У «катле» апынулася 105-тысячная варожая групіроўка, па ліквідацыі якой распачалі баі войскі 2-га і частка сіл 3-га Беларускіх франтоў пры актыўнай падтрымцы авіяцыі і партызан. 7–8 ліпеня былі знішчаны або ўзяты ў палон галоўныя сілы праціўніка, а 9–11 — асобныя групы. Гітлераўцы страцілі забітымі 70 тыс., больш за 35 тыс. былі ўзяты ў палон, сярод іх — 12 генералаў, у тым ліку 3 камандзіры карпусоў і 9 камандзіраў дывізій.

**Чацвёртага ліпеня** завяршыўся першы этап грандыёзнай бітвы за Беларусь. Савецкія войскі за два тыдні баявых дзеянняў разграмілі галоўныя сілы нямецкай групы армій «Цэнтр» і вызвалілі Мінск. У выніку ўтварыўся вялікі пралом да 400 км на фронце і да 500 км у глыбіню тэрыторыі, закрыць які хутка нямецкаму камандаванню не было кім.

Ужо 4 ліпеня войскі 3-га Беларускага фронту вялі баі на рубяжы возера Нарач, Смаргонь, Маладзечна, Краснае, Волма. **5 ліпеня** яны авалодолі Маладзечна, **16 ліпеня** — Гродна.

Разам з савецкімі авіяцыйнымі часцямі ў складзе 1-й паветранай арміі самаадданна змагаўся 1-ы асобны знішчальны авіяполк французскіх лётчыкаў «Нармандыя». За мужнасць і гераізм, праяўленыя французскімі лётчыкамі пры вызваленні Беларусі, і ў прыватнасці на рацэ Нёман, палку была прысвоена назва «Нёманскі».

Войскі 1-га Беларускага фронту працягвалі наступаць на баранавіцка-брэсцкім і пінскім напрамках. **Восьмага ліпеня** былі вызвалены Баранавічы, **14 ліпеня** — Пінск. Праз 4 дні яны перайшлі мяжу Польшчы і 23 ліпеня ўступілі ў Люблін, што з'явілася падзеяй, якая мела далёка ідучыя палітычныя наступствы.

**Дваццаць восьмага ліпеня** ў выніку рашучага штурму быў узяты Брэст. Гэты дзень стаў знамянальным у гісторыі беларускага народа: нашы войскі завяршылі выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з беларускай зямлі.

У ходзе паспяховага завяршэння аперацыі «Баграціён» савецкія войскі знішчылі і ўзялі ў палон звыш 500 тыс. гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Фактычна перастала існаваць адна з наймацнейшых групіровак нямецка-фашысцкай арміі — група армій «Цэнтр». Па прызнанні нацысцкіх лідэраў, разгром германскіх войскаў у Беларусі з'явіўся «значна большай катастрофай, чым пад Сталінградам».

Яшчэ 1 чэрвеня, адчуваючы хуткае паражэнне, германскае кіраўніцтва вымушана было прыняць і распаўсюдзіць спецыяльную дырэктыву аб эвакуацыі з усходніх акупіраваных раёнаў СССР. Настаўніку пажадана азнаёміць вучняў з асноўнымі момантамі гэтага дакумента, які даволі яскрава характарызуе не толькі складанасць сітуацыі для агрэсараў, але і рабаўніцкія метады іх дзеянняў падчас адступлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Об эвакуации оккупированных восточных районов

...Согласно приказу главного командования сухопутных войск (начальник генерального штаба), за планомерную эвакуацию и спасение персонала и материалов ответственны командующие группами армий. Кроме того, они имеют право отдавать обязательные приказы всем военным и гражданским инстанциям.

Чтобы меры по подготовке и проведению хозяйственной эвакуации включались в общую эвакуацию под командованием группы армий, установлены следующие основные положения.

Определения понятий:

**А.** *Рассредоточение.*

Его целью является подготовка и облегчение эвакуации. Чтобы достичь этого, следует своими собственными силами, лучше всего свободными от ведения боевых операций, отправлять в тыл без задержки нужный груз. Требуется точно определить маршруты для осуществления эвакуации. Переход от рассредоточения к непосредственной эвакуации осуществляется исходя из положения на фронте, поэтому он должен быть предписан военным руководством. Рассредоточение должно облегчить эвакуацию.

**Б.** *Эвакуация.*

1. Цель:

а) укрыть в безопасных местах самый важный в эвакуируемом районе персонал, материалы для ведения войны и военное хозяйство;

б) лишить противника всего, что он может использовать в военных целях;

в) при осуществлении эвакуации учитывать требования войск, ведущих боевые действия;

г) из политических соображений охранять эвакуируемое население, не допуская его захвата большевиками.

2. Эвакуация включает:

а) Отвод и укрытие.

Имеет целью отвести в тыл все использующиеся в хозяйстве личные силы и захваченное население, а также все сырье, запасы скота, фонды всех видов, машины, аппараты, готовые изделия и т. д., чтобы сохранить людей и различное имущество и обеспечить возможность их дальнейшего использования.

Средствами эвакуации являются железная дорога, грузовые автомашины, принятые в данной стране транспортные средства и тягачи (при эвакуации наземными средствами).

б) Парализацию.

Ее цель: при временном оставлении района помешать противнику тотчас привести в действие жизненно важные учреждения, предприятия и машины, а также иметь открытую возможность при повторном занятии снова пустить их в ход.

в) Разрушение.

Оно имеет целью всеми средствами и на возможно долгое время затруднить противнику ведение войны и хозяйственное использование района эвакуации. Осуществление этого мероприятия возлагается на войска.

Общие основы:

1. Мероприятия, необходимые на случай планомерного рассредоточения или эвакуации, должны быть определены в эвакуационных календарях (планах). При этом должны быть определены последовательность и срочность порядка эвакуации средств производства, рабочей силы, специалистов, населения и т. д. Важное для ведения войны хозяйственное имущество может превосходить по значению менее важное имущество вермахта, организации Тодта по строительству автострад или прочее имущество. Через экономические инстанции при военных органах командования нужно добиться ясного объяснения этого факта войскам, организации Тодта и др.

2. Условием успеха хозяйственной эвакуации является тесная и длительная связь экономических и военно-экономических инстанций с ответственными сотрудниками военных штабов (начальником экономического управления при группе армий и начальником экономической группы или отдела штаба армии), а также постоянное знание обстановки на фронте. Связь между местными инстанциями и органами военного командования, соответствующими этой сфере (командиры корпусов, дивизий и т. д.), должна гарантироваться соответственно начальником экономического управления штаба группы армий или начальником экономической группы штаба армии. При этом эвакуация осуществляется в порядке срочности по плану с соблюдением всех мер по рассредоточению, парализации и разрушению.

3. Тактические руководящие инстанции только тогда могут надлежащим образом учитывать потребности хозяйства при отдаче приказа для эвакуации, когда они в основном информированы о значении и размере всех имеющихся в их районе хозяйственных ценностей и сил (запасов хозяйственных материалов, средств производства, рабочей силы и т. д.) и месте их развертывания.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Руководители служебных инстанций должны постоянно иметь данные, необходимые для планомерного осуществления эвакуационных мер. Они должны постоянно следить, чтобы состояние и развертывание подчиненного им завода, предприятия, устройства, а также приборы, рабочую силу непрерывно учитывали в эвакуационных планах.

5. Решающее значение в случае эвакуации имеет установление и сохранение линий связи. Военно-хозяйственные инстанции должны поддерживать связь с каждой АТС (вермахта), гражданскими хозяйственными учреждениями, в том числе и с сельскохозяйственными руководителями районов. Сотрудничество с почтовыми службами гарантирует сохранение связи до последнего момента.

В районе операций следует заранее надежно поставить сотрудничество с руководителями армейской службы связи, полевыми комендатурами связи и т. д. В случае необходимости следует вводить для отдаленных предприятий, учреждений, сельскохозяйственных опорных пунктов и т. д. особые службы летучей почты и установить ответственность за дальнейшую передачу приказов об эвакуации, маскировке и т. д.

6. При транспортном планировании необходимо теснейшее сотрудничество со всеми работниками транспортной службы. Необходимо с самого начала принять во внимание степень спешности, чтобы прежде всего эвакуировать наиболее важные для войны материалы.

7. Планомерная эвакуация требует, кроме того, срочного, осуществляемого по единому плану разъяснения ее причин местному населению, руководства им и использования его при ее проведении. Лишь теснейшее сотрудничество и связь всех инстанций, которые должны быть осуществлены задолго до эвакуации, могут привести к успешному решению задачи.

8. Каждый должен знать, что при эвакуации необходимо решать те же задачи, что и при наступательном марше, только в обратной последовательности. То, что сначала было организовано для снабжения сражающегося фронта, будет впоследствии свернуто. Эта боевая задача требует жертв. Войска должны ясно представлять себе, что именно для их обеспечения личный состав экономических инстанций обязан продолжать работу и, следовательно, оставаться на своих местах.

9. Каждая инстанция, каждый руководитель предприятия, каждый работник должен отвечать за свой участок, чтобы эвакуация подготавливалась и осуществлялась согласно директиве.

10. Право отдачи приказа: главный штаб вооруженных сил и главное командование сухопутных сил определяют мероприятия по рассредоточению, эвакуации, парализации и разрушению для определенных участков на направлениях перемещений войск; распоряжения отдаются также командованием группы армий через начальника экономического управления или командованием армии через начальника экономической группы штаба армии; только при непосредственной опасности приказ о рассредоточении может быть отдан низшей руководящей инстанцией через непосредственные директивы местным инстанциям с одновременным рапортом об этом командованию армией. Оно выносит решение о том, что нужно парализовать или разрушать.

Мероприятия по разрушению принципиально проводятся войсковыми частями или прямо назначенными ими специалистами.

11. Специальная эвакуация. В случае необходимости осуществления одновременно мероприятий по рассредоточению, эвакуации, парализации, разрушению на отдельных участках вводится специальная эвакуация. Для ее осуществления в общем ходе эвакуации требуется утверждение приказом компетентного военного штаба.

*Працяг будзе*

*Сардэчна віншуем гістарычны факультэт БДУ з 70-годдзем!*

**Жадаем калектыву гістарычнага факультэта і ў далейшым займаць передавыя пазіцыі ў беларускай гістарычнай навуцы і ў выхаванні моладзі.**

**Клопат аб захаванні гістарычнай памяці і памнажэнні традыцый — Ваш важкі ўклад у справу служэння багіні Кліо.**

**Выпускнікі факультэта з удзячнасцю ўспамінаюць гады вучобы, сваіх выкладчыкаў.**

***Калектыў гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ